База данных
«Гомель в печати»
© gorbibl.gomel.by

# НАЗВАЛІ ДЫВІЗІЮ ГОМЕЛЬСКАЙ

26 лістапада 1943 года нашай 283-й стралковай Чырванасцяжнай дывізіі загадай Вярхоўнага Галоўна-камандуючага была прысвоена ганаровая назва Гомельскай. Яна вяла баі на поўнач ад горада на Сожы ў са-ставе 3-й арміі. 22 лістапада яе часці паспяхова прарвалі абарону праціўніка на гэтай рацэ ў раёне Кармяншчыны і, развіваючы наступленне, перарэзалі дарогі, якія ідуць з поўначы да Гомеля.

З выхадам часцей дывізіі на ракадную дарогу групоўка праціўніка, якая знаходзілася паміж Сожам і Дняпром, была разрэзана. Вораг перакінуў у гэты раён войскі з іншых участкаў і раніцай 25 лістапада пачаў бесперапынныя контратакі сіламі, якія ў тры-чатыры разы пераўзыходзілі нашы. Жорсткія і ўпартыя баі ўдзень і ўначы. Асабліва цяжкі давялося весці 858-му палку падпалкоўніка А. М. Карабейнікава.

Камандзір аднаго з батальёнаў капітан Б. М. Патырмін заявіў: “Памром, але не адступім!». Камбат сам лёг за кулямёт і агнём з яго адрэзаў пяхоту ад танкаў. Адна варожая машына гўшчыльную наблізілася да пазіцыі кулямёта і гарматным выстралам зрэзала адважнага камбата. Камуніст Барыс Мікалаевіч Патырмін быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны першай ступені пасмяротна.

Героем дня быў і камандзір - мінамётнай роты старшы лейтэнант П. Д. Вінічэнка. Салдаты пад яго камандаваннем актыўна ўдзельнічалі ў адбіцці контратак ворага. Агнявыя пазіцыі не раз аказваліся ў непасрэднай блізкасці ад праціўніка і падвяргаліся моцнаму абстрэлу. Але і ў гэтых умовах Вінічэнка працягваў бой ва ўпор расстрэльваючы фашыстаў. Больш 80 забітых гітлераўцаў засталіся і на яго полі ад трапнага агню мінамётчыкаў. Смяротна ранены ў апошнія мінуты бою адважны камандзір не спыняў агню. Паміраючы на руках сваіх байцоў, ён наказваў ім стойка змагацца за любімую Радзіму. Пятру Дзмітрыевічу Вінічэнку было прысвоена званне Героя Савецка-га Саюза.

Раніцай 26 лістапада праціўнік зноў пачаў контратакі, з трох бакоў наносіў удары да пазіцыях нашых палкоў. У гэты дзень было адбіта 6 контратак ворага. Асаблівую стойкасць праявілі гвардзейцы-артылерысты. Камандзір узвода Н. В Жураўлёў і камандзір гарматы К. Е. Белянкоў выкацілі свае гарматы на пазіныі для стральбы прамой наводкай. Гітлераўцы, несучы страты, пачалі кідацца па полі, потым залеглі і стралялі з аўтаматаў і кулямётаў. Вакол гвардзейцаў свісталі кулі, клявалі шчыты гармат. Але Жураўлёў і Белянкоў не спынялі агню. Адзінаборства цягнулася некалькі мінут пакуль фашысты не адкаціліся назад, пакінуўшы на полі бою звыш 40 трупаў.

Лейтэнант Жураўлёў быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, а сяржант Белянкоў — ордэнам Славы другой ступені.

Такіх подзвігаў было шмат. У баях паміж Сожам і Дняпром нарадзіліся першыя кавалеры ордэна Славы. У ліку іх - сапёр І. Т. Булгакаў (пазней — поўны кавалер ордэнаў Славы), разведчык В І. Апацьеў, артылерыст К. Е. Белянкоў, стралкі Н. М. Галкін, І. В. Грышын, Г. Г. Канстанцінаў, І. Таджыеў і іншыя. За перыяд з 22 па 26 лістапада наша дывізія вызваліла больш 30 населеных пунктаў Гомельскай І Магілёўскай абласцей, Яна нанесла вялікія страты праціўніку ў жывой сіле і тэхніцы, сарвала яго планы па аднаўленню дарогі Магілёў — Гомель і тым самым садзейнічала авалоданню Гомелем.

**А. ДЗЯРАЕЎ, ветэран 283-й стралковай дывізіі**